БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ

УДК 882.6.09-93 (043.3)

ПУЧЫНСКАЯ
Таццяна Міхайлаўна

# МЕТОДЫКА ВЫВУЧЭННЯ ПРАЗАІЧНЫХ ТВОРАЎ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ НА АСНОВЕ ІХ ЖАНРАВАЙ СПЕЦЫФІКІ (7 – 11 КЛАСЫ)

13.00.02. – тэорыя і методыка навучання і выхавання
(беларуская літаратура)

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата педагагічных навук

Мінск, 2004

Репозиторий БарГУ

Работа выканана ў навукова-метадычнай установе "Нацыянальны інстытут адукацыі" Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік | доктар філалагічных навук,<br>прафесар **Бельскі А.І.**,<br>Белдзяржуніверсітэт,<br>кафедра беларускай літаратуры XX стагоддзя |
| Афіцыйныя апаненты | доктар філалагічных навук, прафесар,<br>член-карэспандэнт БелАА **Мішчанчук М.І.**,<br>установа адукацыі "Брэсцкі педагагічны універсітэт імя А.С. Пушкіна", кафедра тэорыі і гісторыі рускай літаратуры<br><br>кандыдат педагагічных навук **Слесарава І.М.**,<br>установа адукацыі "Акадэмія паслядыпломнай адукацыі", кафедра філасофіі і гуманітарных праблем адукацыі |
| Апаніруючая арганізацыя | установа адукацыі "Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Я.Купалы" |

Абарона адбудзецца 12 лютага 2004 г. у 14.00 гадзін на пасяджэнні савета Д 02.01.21 па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасу: 220050, г. Мінск, вул. К.Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; тэл. 226-55-41.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага універсітэта (г. Мінск, пр-т Ф.Скарыны, 4).

Аўтарэферат разасланы "10" студзеня 2004 г.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый
кандыдат педагагічных навук,
дацэнт **Т.У. Ігнатовіч**

Репозиторий БарГУ

2004-4
7565



6 70088

# АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць дысертацыйнага даследавання** абумоўлена галоўнымі мэтамі рэфармавання школьнай адукацыі, у выніку іх рэалізацыі павінна быць выхавана ўсебакова развітая, творчая, высокакультурная асоба, здольная ўнесці свой асабісты ўклад у развіццё гуманітарна-духоўнай культуры грамадства. Адзін з дзейсных шляхоў літаратурнага навучання – развіццё ў вучняў уяўленняў пра жанравую спецыфіку празаічных твораў з мэтай больш глыбокага спасціжэння жыццёва-пазнавальнага, гуманістычнага і эстэтычнага пафасу літаратуры.

Ва ўмовах пашырэння масавай культуры, рэкламнай індустрыі, зніжэння статуса чытання асабліва значным бачыцца далучэнне школьнікаў да складаных форм духоўных набыткаў чалавецтва – сучаснай беларускай прозы, прадстаўленай творчасцю В.Быкава і В.Казько. Дзякуючы завостранай маральна-філасофскай праблематыцы, аповесці і раманы беларускіх аўтараў, вывучаемыя ў кантэксце нацыянальнай і сусветнай літаратуры (Я.Брыль, Ф.Дастаеўскі, А.Камю), маюць высокі выхаваўчы патэнцыял, ствараюць шырокія магчымасці ў фарміраванні актыўнай жыццёвай пазіцыі моладзі.

Школьная практыка пераконвае ў тым, што пры судакрананні з творамі В.Быкава і В.Казько ў вучняў узнікае эмацыянальны водгук, які, на жаль, часцей за ўсё нельга лічыць прыкметай граматнага чытача. Прычына заключаецца ў хісткасці, павярхоўнасці ўспрымання мастацкіх вобразаў. Ідэйна-тэматычны аспект выкладання прозы, які ў большасці выпадкаў традыцыйна прысутнічае ў школе, не ўспрымаецца як аптымальны варыянт вырашэння праблемы, паколькі ён не забяспечвае ўспрыманне твора ў гарманічным адзінстве зместу і формы (акцэнтуе ўвагу на змесце), а значыць і не спрыяе працэсу паўнавартаснай мастацкай камунікацыі. Для глыбокага спасціжэння маральна-філасофскай праблематыкі прозы неабходна апора на навуковы фундамент, у якасці якога выступаюць тэарэтыка-літаратурныя паняцці, у т.л. жанр – цэнтральная літаратуразнаўчая катэгорыя. Адукацыйная задача заключаецца ў тым, каб, выкарыстаўшы эстэтычны патэнцыял жанравай спецыфікі твора, пашырыць уяўленні вучняў сярэдніх і старшых класаў пра мастацкія асаблівасці літаратуры, забяспечыць творчае прачытанне аповесцей і раманаў. Тэарэтычны аспект пры выкладанні прозы, не з'яўляючыся самамэтай, мае несумненную практычную значнасць і абумоўлівае не толькі адукацыйныя, але і выхаваўчыя мэты.

Аналіз кантрольных зрэзаў выявіў, што веды школьнікаў па тэорыі літаратуры ніжэйшыя, чым патрабуе праграма. Канстатуючы эксперымент таксама пацвердзіў, што слабае валоданне вучнямі тэарэтыка-літаратурнымі паняццямі, у прыватнасці, звязанымі з жанравай спецыфікай прозы, сапраўды адмоўна ўплывае на разуменне вучнямі праблематыкі аналізуемых твораў, іх мастацка-эстэтычнай сутнасці, звужае выхаваўчы патэнцыял урока літаратуры

[ГОСУДАРСТВЕННАЯ]
БИБЛИОТЕКА
С Петербург
2004 РК

Рэпазіторый БарГУ

Школьнікі не ўмеюць ацэньваць фармальныя і змястоўныя якасці твора ў іх адзінстве, вылучаць стылёвыя асаблівасці прозы, мастацкі кантэкст аповесцей, раманаў. Павярхоўнасць сфарміраваных чытацкіх навыкаў абумоўлівае той факт, што вучні і сярэдніх, і старшых класаў у пераважнай большасці арыентуюцца на сюжэтную літаратуру, якая не патрабуе асаблівых духоўных і інтэлектуальных намаганняў для разумення мастацкіх вобразаў.

Жанр – трывалая аснова, якая дазваляе цэласна, сістэмна, глыбока ўспрымаць празаічны твор. Літаратуразнаўцы і метадысты (М.М. Бахцін, Дз.С. Ліхачоў, Г.М. Паспелаў; В.П. Жураўлёў, В.У. Івашын, М.А. Лазарук і інш.), па-рознаму падыходзячы да разгляду пытання, тым не менш сыходзяцца ў меркаванні, што жанр мае несумненную тыпалагічную, семантычную і эстэтычную значнасць, універсальныя магчымасці ў выяўленні традыцыйнага і наватарскага ў творы, стылёвых асаблівасцей літаратуры.

Аналіз літаратуразнаўчага матэрыялу сведчыць пра пастаянную цікавасць навукоўцаў (М.І. Мішчанчук, А.М. Макарэвіч, Л.Дз. Сінькова, І.С. Шпакоўскі, А.С. Яскевіч і інш.) да пытанняў паэтыкі і праблемы жанру, якая актыўна распрацоўваецца ў беларускай навуцы на сучасным этапе.

У дачыненні да беларускай літаратуры праблема сістэмнага вывучэння празаічных твораў з улікам жанравай спецыфікі канчаткова не вырашана. Неабходна пазбегнуць некаторай фрагментарнасці ў падыходах да аналізу мастацкай прозы ў сярэдніх і старшых класах, акрэсліць яе канцэптуальнае значэнне. Сучасны стан выкладання літаратуры актуалізаваў патрэбу далейшай распрацоўкі азначанай праблемы ў напрамку асэнсавання тэарэтыка-метадалагічных асноў вывучэння сучаснай беларускай прозы, а таксама практычных рэкамендацый для настаўнікаў сярэдніх школ, што ў сваю чаргу падкрэслівае значнасць праробленага даследавання.

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі, тэмамі**. Даследаванне грунтуецца на палажэннях ”Канцэпцыі рэформы агульнаадукацыйнай школы ў Рэспубліцы Беларусь” (1996), "Канцэпцыі рэфармавання літаратурнай адукацыі" (1996), ”Канцэпцыі выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь” (2000) і непасрэдна звязана з навукова-даследчымі тэмамі, якія выконваліся ў лабараторыі тэорыі і методыкі навучання мовам і літаратуры Нацыянальнага інстытута адукацыі:

1. “Педагагічнае праектаванне складу і структуры зместу адукацыі па беларускай і рускай літаратуры ў сярэдняй агульнаадукацыйнай школе з 12-гадовым навучаннем” (1997 – 1999 гг., дзяржаўны рэгістрацыйны нумар 19973844).
2. “Навукова-метадычнае і дыдактычнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу ў школе з 12-гадовым навучаннем” (2000 – 2003 гг., дзяржаўны рэгістрацыйны нумар 200013115).

Рэпазіторый БарДУ

<u>**Мэта даследавання**</u> – распрацаваць методыку вывучэння ў 7 – 11 класах празаічных твораў сучаснай беларускай літаратуры на аснове іх жанравай спецыфікі.

Зыходзячы з мэты даследавання, неабходна было вырашыць <u>**наступныя задачы**</u>:

1. Прааналізаваць філасофскую, літаратуразнаўчую, псіхалагічную, метадычную літаратуру з мэтай выяўлення ступені распрацаванасці праблемы вывучэння празаічных твораў на аснове жанравай спецыфікі ў сярэдняй школе.
2. Выявіць узровень ведаў і ўяўленняў вучняў сярэдніх і старшых класаў пра жанравыя асаблівасці мастацкай прозы В.Быкава і В.Казько.
3. Вызначыць умовы, пры якіх развіццё ведаў і ўяўленняў школьнікаў пра творы беларускай прозы ў іх жанравай спецыфіцы з'яўляецца найбольш дзейсным.
4. Распрацаваць навукова абгрунтаваную методыку вывучэння аповесцей і раманаў В.Быкава і В.Казько з улікам жанру ў 7 – 11 класах.
5. Правесці вопытна-эксперыментальную праверку прапанаванай методыкі і падрыхтаваць для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ метадычныя парады па вывучэнні беларускай прозы на аснове жанравай спецыфікі ў сярэдніх і старшых класах.

<u>**Аб'ект даследавання**</u> – працэс вывучэння празаічных твораў сучаснай беларускай літаратуры на аснове жанру ў 7 – 11 класах сярэдняй школы.

<u>**Прадмет даследавання**</u> – методыка вывучэння празаічных твораў В.Быкава і В.Казько з улікам жанравай спецыфікі ў 7 – 11 класах сярэдняй школы.

<u>**Гіпотэза даследавання**</u>. Вывучэнне празаічных твораў сучаснай беларускай літаратуры ў жанравай спецыфіцы ў 7 – 11 класах будзе эфектыўным пры ўмове:

а) засваення школьнікамі цэласнай сістэмы прыкмет, якія вызначаюць жанравую спецыфіку твора (тэматыка, кампазіцыя, мастацкая дэталь, моўнае афармленне, эстэтычны фон, стыль, творчы метад);

б) сфарміраванасці ўменняў вучняў спалучаць тэарэтычны аналіз твора з высвятленнем праблематыкі, ідэйна-маральнага зместу, аўтарскай пазіцыі;

в) выкарыстання спецыяльнай методыкі вывучэння празаічных твораў В.Быкава і В.Казько ў жанравай спецыфіцы на ўроках беларускай літаратуры, аснову якой складаюць творчы і сістэмны прынцыпы навучання, а таксама паэтапная (прапедэўтычны – 7 клас, асноўны – 9 клас, заключны – 11 клас) работа, накіраваная на фарміраванне духоўна багатай асобы, зарыентаванай на агульначалавечыя каштоўнасці.

<u>**Метадалогія і метады даследавання.**</u>

Метадалагічныя асновы даследавання вызначаюцца:

- філасофскімі палажэннямі аб ролі мастацтва як эстэтычнай сістэмы ў

Рэпазіторый БарДУ

фарміраванні светапогляду і духоўнага патэнцыялу асобы (Г.В. Гегель, Ф.В.Шэлінг, М.М. Бахцін, Ю.Б. Бораў, Р.Барт, Х. Артэга-і-Гасет, М.Б. Храпчанка і інш.);

- тэорыяй развіцця асобы, распрацаванай у псіхалогіі (Л.С. Выгоцкі, П.Я. Гальперын, В.В. Давыдаў, А.М. Лявонцьеў);

- літаратуразнаўчымі канцэпцыямі пра жанравую спецыфіку прозы (В.М. Жырмунскі, Дз.С. Ліхачоў, Г.М. Паспелаў, В.М. Фрэйдэнберг, Г.Л. Няфагіна; В.П. Жураўлёў, В.А. Каваленка, М.А. Лазарук, А.М. Макарэвіч, М.І. Мішчанчук, А.С. Яскевіч і інш.);

- навуковым прынцыпам апоры на мастацкую, у т.л. жанравую, спецыфіку літаратуры ў яе школьным выкладанні (В.В. Галубкоў, У.Г. Маранцман, Н.Д. Малдаўская, З.Я. Рэз; І.І. Замоцін, А.І. Бельскі, В.У. Івашын, В.Я. Ляшук, А.І. Лугоўскі, М.І. Мішчанчук, Т.Ф. Мушынская, Н.Б. Рашэтнікава, І.М. Слесарава);

- праграмамі па развіцці нацыянальнай сістэмы адукацыі ("Канцэпцыя рэфармавання агульнаадукацыйнай школы Рэспублікі Беларусь", "Канцэпцыя рэфармавання літаратурнай адукацыі").

Метады даследавання: тэарэтычны аналіз філасофскай, псіхолага-педагагічнай, літаратуразнаўчай і метадычнай літаратуры ў аспекце пастаўленай праблемы, вывучэнне педагагічнага вопыту настаўнікаў, аналіз сучаснага стану выкладання літаратуры ў школе, праграм і падручнікаў; назіранне за педагагічным працэсам агульнаадукацыйнай школы, анкетаванне, канстатуючы педагагічны эксперымент, фарміруючы педагагічны эксперымент з мэтай апрабацыі прапанаванай методыкі, колькаснае і якаснае абагульненне вынікаў эксперыментаў.

Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць атрыманых вынікаў заключаюцца ў наступным:

- вызначана праблемная насычанасць і выхаваўчы патэнцыял твораў В.Быкава (7 – 11 класы), В.Казько (11 клас) з улікам эстэтыка-філасофскай і жанрава-стылёвай спецыфікі беларускай прозы;

- выяўлена роля жанравай спецыфікі празаічнага твора ў забеспячэнні сістэмнасці, упарадкаванасці, дастатковасці, інфармацыйнай насычанасці літаратуразнаўчай адукацыі школьнікаў;

- сістэматызаваны тэарэтыка-літаратурныя паняцці (тэматыка, кампазіцыя, мастацкая дэталь, моўнае афармленне, эстэтычны фон, стыль, творчы метад), звязаныя з жанравай характарыстыкай твора, у дачыненні да сярэдніх і старшых класаў;

- абгрунтаваны, сістэматызаваны і пашыраны спосабы і метады працы над празаічнымі творамі на аснове жанравай спецыфікі;

- распрацавана і эксперыментальна праверана методыка вывучэння аповесцей і

Рэпазіторый БарДУ

раманаў В.Быкава і В.Казько (7 – 11 класы) і іх жанравай спецыфікі ў аспекце ўдасканалення літаратурнага навучання, павышэння яго эфектыўнасці і дзейснасці ў фарміраванні рознабакова развітай, высокаадукаванай асобы.

Практычная значнасць атрыманых вынікаў заключаецца ў выкарыстанні на ўзроўні навукова-метадычнага забеспячэння выкладання курса беларускай літаратуры ў сярэдніх і старшых класах; павышэнні якасці літаратурнай адукацыі і ўзроўню літаратурнага развіцця вучняў сярэдніх і старшых класаў шляхам высвятлення ўзаемасувязі паміж формай і зместам празаічных твораў, што выяўляецца ў структурна-жанравай спецыфіцы мастацкага тэксту; ва ўдасканаленні методыкі навучання сучаснай беларускай літаратуры; у распрацоўцы для настаўнікаў агульнаадукацыйных школ метадычных парад адносна зместу і спосабаў работы па фарміраванні ў вучняў 7 – 11 класаў уяўленняў пра жанравыя асаблівасці беларускай прозы.

Вынікі могуць быць выкарыстаны настаўнікамі школ на ўроках літаратуры; пры распрацоўцы праграм, вучэбных, вучэбна-метадычных дапаможнікаў, падрыхтоўцы спецкурсаў, спецсемінараў па методыцы выкладання літаратуры на філалагічных факультэтах ВНУ, у педкаледжах, на курсах павышэння кваліфікацыі настаўнікаў.

Сацыяльна-эканамічная значнасць атрыманых вынікаў. Выкананая праца садзейнічае інтэнсіфікацыі працэсу вывучэння беларускай літаратуры ў агульнаадукацыйнай школе, павышэнню ўзроўню літаратурнага і рознабаковага развіцця вучняў.

Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.

1. Вывучэнне сучаснай беларускай прозы В.Быкава і В.Казько з улікам эстэтыка-філасофскай і жанрава-стылёвай спецыфікі вучнямі сярэдніх і старшых класаў забяспечвае працэс гарманізацыі асобы, здольнай чуйна ўспрыняць і глыбока асэнсаваць літаратурны твор, ацаніць у ім узаемасувязь з'явы і сутнасці, зместу і формы, агульнага і адзінкавага; развівае гнуткасць мыслення школьнікаў, дапамагае намеціць праграму самаўдасканалення.

2. Жанравы падыход да вывучэння сучаснай беларускай прозы дазваляе пабудаваць мадэль комплекснага авалодання і асэнсавання празаічных твораў праз паняцці, якія: 1) дэманструюць змест, структуру твора (тэматыка, кампазіцыя, мастацка-выяўленчыя сродкі), 2) характарызуюць асаблівасці мастацкай спецыфікі літаратуры (эстэтычны фон), 3) асвятляюць кантэкст гістарычнага працэсу (творчы метад, мастацкі напрамак, стыль у іх тыпалагічным значэнні). Такая шматстайнасць тэарэтыка-літаратурных паняццяў, звязаных з жанрам, дае магчымасць выкарыстання розных аспектаў літаратуразнаўства (ідэйна-эстэтычны, гісторыка-генетычны, гісторыка-функцыянальны і тыпалагічны) пры аналізе аповесці, рамана. Жанр, з'яўляючыся зыходнай (мінімальнай) навуковай асновай выкладання прозы,

Репозиторий БарГУ

спрыяе таму, каб ахапіць максімальную колькасць літаратурных фактаў і з'яў, што дазваляе ўсебакова, у працэсе падрабязнага аналізу вывучыць празаічны твор на ўзроўні сярэдняй школы.

3. Вывучэнне сучаснай беларускай прозы В.Быкава і В.Казько неабходна ажыццяўляць па спецыяльнай методыцы, аснову якой складаюць: жанравая спецыфіка твора, інтэгратыўныя сувязі (літаратура-эстэтыка, літаратура-філасофія, літаратура-мова), гісторыка-генетычны, гісторыка-функцыянальны, тыпалагічны падыходы, творчы і сістэмны прынцыпы навучання, паэтапная (прапедэўтычны – 7 клас, асноўны – 9 клас, заключны – 11 клас) работа, накіраваная на развіццё вуснай і пісьмовай маўленчай дзейнасці вучняў, пашырэнне іх самастойнай працы ў авалоданні і асэнсаванні празаічных твораў, змест якіх фарміруе духоўна багатую асобу, зарыентаваную на агульначалавечыя каштоўнасці.

<u>Асабісты ўклад дысертанта</u>. Даследаванне ўяўляе сабой вынік самастойнай працы. Асабісты ўклад заключаецца ў праведзеным аналізе філасофскай, літаратуразнаўчай, псіхалагічнай, педагагічнай і метадычнай літаратуры па даследуемай праблеме; у стварэнні эксперыментальнай базы даследавання; у падрыхтоўцы навуковых матэрыялаў для правядзення вопытна-эксперыментальнай работы па вывучэнні школьнікамі сучаснай беларускай прозы на аснове жанравай спецыфікі; у распрацоўцы і эксперыментальнай праверцы методыкі вывучэння аповесцей і раманаў В.Быкава і В.Казько ў іх жанравай спецыфіцы і з улікам інтэгратыўных сувязей (літаратура-эстэтыка, літаратура-філасофія, літаратура-мова), што садзейнічае авалоданню і асэнсаванню вучнямі празаічных твораў сучаснай беларускай літаратуры.

<u>Апрабацыя вынікаў дысертацыі</u>. Матэрыялы і палажэнні даследавання абмяркоўваліся: 1) на міжнародных канферэнцыях "Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай" (Мінск, 2001), "Пісьменнік – мова – стыль" (Мінск, 2001), рэспубліканскіх мемарыяльных чытаннях "Навукова-педагагічная і літаратуразнаўчая спадчына акадэміка М.А. Лазарука" (Мінск, 2001), рэспубліканскай канферэнцыі "Актуальныя праблемы літаратурнай адукацыі на сучасным этапе рэформы школы" (Мінск, 2003), 2) міжвузаўскай навукова-метадычнай канферэнцыі, прысвечанай 5-годдзю заснавання філіяла БНТУ г. Баранавічы (Баранавічы, 2002), 3) пасяджэннях секцыі сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у філіяле Беларускага нацыянальнага тэхнічнага універсітэта г. Баранавічы (Баранавічы, 2002), 4) семінары дырэктараў школ Клецкага раёна (2003), 5) у лабараторыі тэорыі і методыкі навучання мовам і літаратуры Нацыянальнага інстытута адукацыі (Мінск, 2003). Асноўны змест дысертацыі апублікаваны ў манаграфіі "Праблема вывучэння жанравай спецыфікі празаічных твораў на ўроках беларускай літаратуры ў 11 класе" (Мінск: УП "Тэхнапрынт", 2003), метадычным дапаможніку "Беларуская

Рэпазіторый БарДУ

літаратура ў школе: вывучэнне сучаснай прозы ў старшых класах" (Мінск: УП "Тэхнапрынт", 2003), навуковых і навукова-практычных часопісах "Роднае слова", "Беларуская мова і літаратура ў школе", "Веснік МДУ імя А.Куляшова".

Матэрыялы дысертацыі выкарыстоўваліся аўтарам на лекцыйных і практычных занятках па беларускай літаратуры на падрыхтоўчым аддзяленні філіяла БНТУ г. Баранавічы.

Апублікаванасць вынікаў дысертацыі. Па тэме дысертацыі апублікавана 10 работ, у тым ліку: манаграфія "Праблема вывучэння жанравай спецыфікі празаічных твораў на ўроках беларускай літаратуры ў 11 класе", метадычны дапаможнік "Беларуская літаратура ў школе: вывучэнне сучаснай прозы ў старшых класах", 3 артыкулы ў навуковых і навукова-метадычных часопісах, 4 артыкулы ў навуковых зборніках, 1 тэзісы даклада навукова-метадычнай канферэнцыі. Агульны аб'ём апублікаваных матэрыялаў 160 старонак. Усе работы напісаны без сааўтарства.

Структура дысертацыі. Дысертацыя складаецца з агульнай характарыстыкі работы, 3 глаў, высноў па главах, заключэння, спісу выкарыстаных крыніц (152 найменні), дадаткаў. Поўны аб'ём дысертацыі складае 114 старонак, у тым ліку 10 старонак займае спіс выкарыстаных крыніц, 6 – дадаткі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

**У агульнай характарыстыцы работы** абгрунтоўваюцца актуальнасць выбранай тэмы, яе тэарэтычная і практычная значнасць, вылучаецца гіпотэза, сфармуляваны мэта, задачы даследавання, палажэнні, што выносяцца на абарону.

**У першай главе "Літаратуразнаўчыя і псіхолага-педагагічныя асновы вывучэння сучаснай беларускай прозы ў школе"** асэнсоўваецца праблема жанрава-мастацкай спецыфікі празаічных твораў у філасофіі, эстэтыцы, літаратуразнаўстве, высвятляецца псіхолага-педагагічны і метадычны аспект пытання вывучэння прозы праз прызму жанру ў 7 – 11 класах.

Дзякуючы універсальнай магчымасці адлюстроўваць тыпалагічную і семантычную сутнасць твора, жанр трывала ўвайшоў у навуковы ўжытак. Сярод іншых тэарэтыка-літаратурных паняццяў у школьнай праграме па беларускай літаратуры (Мінск, 2002) родава-жанравай сістэме адведзена прыкметнае месца. Па сутнасці, менавіта жанр вызначае логіку вывучэння праграмнага матэрыялу: у сярэднім звяне – на ўзроўні паэтыкі твора, у старшых класах – стылёвых адметнасцей прозы. На нашу думку, такі падыход да канцэпцыі школьнага выкладання літаратуры з'яўляецца абгрунтаваным і заканамерным. Так, у пераважнай большасці даследчыкі (М.М. Бахцін, Ю.Б. Бораў, Г.М. Паспелаў, М.В. Палякоў, А.М. Фрэйдэнберг, В.П. Жураўлёў, В.У. Івашын, М.А. Лазарук, М.І. Мішчанчук, А.М. Макарэвіч, І.С. Шпакоўскі і інш.) вызначаюць жанр як

Репозиторий БарГУ

умову, якая дазваляе пабудаваць эфектыўную мадэль успрымання і разумення літаратурнага твора.

Складанасць паняцця жанру, розныя падыходы да разумення яго сутнасці ў многім абумоўліваюць той факт, што ў школьнай практыцы пры вызначэнні жанравай спецыфікі прозы (аповесць, раман) школьнікі карыстаюцца колькаснай характарыстыкай (аб'ём твора). Як паказалі праведзеныя даследаванні, методыка працы з літаратурным тэкстам ва ўмовах, калі жанр ператвараецца ў фармальную адзінку вымярэння, з'яўляецца неэфектыўнай. Неабходна мець на ўвазе, што на сучасным этапе развіцця мастацтва, арыентуючыся на колькасныя параметры, часта нават фармальна немагчыма высветліць жанравую спецыфіку прозы, не кажучы пра эстэтычную і семантычную сутнасць аповесці, рамана. Па сваёй прыродзе жанр з'яўляецца кананічнай, устойлівай формай, аднак у апошні час назіраецца відазмяненне і актыўнае ўзаемадзеянне жанравых структур, што праяўляецца ў наступным:

а) родавыя перакрыжаванні ў межах аднаго твора (напрыклад, драматызаваная, лірычная проза); б) жанравы рух у межах прозы: узаемадзеянне жанравых прынцыпаў апавядання і аповесці, аповесці і рамана, т. зв. раманізацыя празаічных твораў; в) дынаміка ў межах аднаго жанру (аповесць бытавая, сацыяльна-бытавая, псіхалагічная, лірычная і інш.).

Працэс узаемадзеяння розных літаратурных жанраў адзначаны ў працах М.М. Бахціна, П.К. Дзюбайлы, І.С. Шпакоўскага. Назіранне за жанрам як адкрытай формай, што знаходзіцца ў пастаянным руху, развіцці, дазваляе наблізіць школьнае выкладанне літаратуры да канцэптуальнасці, якая грунтуецца на разуменні вучнямі стылёвых асаблівасцей прозы.

Праблема жанру – гэта выяўленне сістэмы прымет, якія дэманструюць тыпалагічную цэласнасць і семантычную сутнасць твора. Асобныя вучоныя (Г.Паспелаў) лічаць, што характарыстыка жанру заключана перш за ўсё ў змесце твора, "яго гістарычным аспекце"; іншыя (Артэга-і-Гасет) вызначаюць жанр як асобную эстэтычную катэгорыю, скрайняй пазіцыі ўласцівы пошук толькі фармальных паказальнікаў (жанр як знешняя схема пісьма). Традыцыйны пункт гледжання на жанраўтваральныя фактары абапіраецца як на асаблівасці зместу, так і формы твора, дакладней, гаворка ідзе пра жанр як "генную праграму", якая праяўляецца і ў змесце, і ў форме мастацкага тэксту. Даследчыкі адзначаюць, што градацыю жанравых форм неабходна звязваць і са зменамі семантычнага ядра, і з прынцыпамі кампазіцыі, сродкамі паэтычнай выразнасці. "Асноўныя характарыстыкі жанру, так сказаць, яго апорныя часткі, гэта: 1) эстэтычная аснова адносін да рэчаіснасці; 2) абхват рэчаіснасці (апавяданне – раман); 3) тып выкладу (апавяданне, апісанне, дыялог); 4) кампазіцыйная структура (роля дзеяння, персанажаў, абставін); 5) характар арганізацыі слоўнай тканіны (рытм, інтанацыя, тропы і г. д.)"

Рэпазіторый БарГУ

(М. Палякоў).

Такім чынам, відавочна, што жанр сапраўды з'яўляецца універсальнай характарыстыкай аповесцей, раманаў. Ён звязаны з рознымі групамі тэарэтыка-літаратурных паняццяў, усімі аспектамі літаратуразнаўства (эстэтычным, тыпалагічным, гісторыка-генетычным, гісторыка-функцыянальным).

Разгледжаныя тэарэтыка-метадалагічныя падыходы поўнасцю не вычэрпваюць праблему жанру, аднак даюць магчымасць навукова абгрунтаваць асновы фарміравання паняцця пра жанр пры вывучэнні сучаснай беларускай прозы ў 7 – 11 класах.

Трывалую метадалагічную аснову для распрацоўкі сістэмнага вывучэння аповесцей і раманаў склалі працы выдатных вучоных-метадыстаў В.В. Галубкова, В.Г. Маранцман, З.І. Рэз, Н.Д. Малдаўскай, І.І. Замоціна і інш.; улічаны таксама вопыт, прадстаўлены ў сучасных метадычных дапаможніках, школьнай практыцы. Вызначальным момантам сталі асноўныя прынцыпы Канцэпцыі рэфармавання літаратурнай адукацыі (Мінск, 1996), змест якой бачыцца ў выхаванні асобы як сэнсавай катэгорыі – творчай, пазітыўна свабоднай, падрыхтаванай да жыцця ў зменлівым свеце, успрымальнай да духоўных каштоўнасцей і ідэй гуманізму.

**У другой главе "Узровень ведаў і ўменняў вучняў пра жанравую спецыфіку празаічных твораў"** прааналізаваны праграмы і падручнікі па беларускай літаратуры, апісаны вопыт канстатуючага эксперыменту (7 – 11 класы СШ № 2, 3 г. Клецка, Грыцэвіцкая, Заастравецкая, Сіняўская СШ Мінскай вобласці, слухачы падрыхтоўчага аддзялення БНТУ, філіял г. Баранавічы; 320 вучняў і слухачоў), які паказаў, што вучні маюць больш развітыя ўменні аналізу прозы павобразным шляхам, "услед за аўтарам". Разам з тым на нізкім узроўні знаходзяцца ўменні і навыкі, звязаныя з кантэкстуальнай мастацкай ацэнкай твораў. Аналіз анкетных пытанняў засведчыў, што школьнікі старшых класаў часцей за ўсё не гатовы ўспрымаць маральна-філасофскую прозу (77 % з 248 апытаных), што пры чытанні вучняў 7 – 11 класаў цікавіць толькі займальны сюжэт (50,6 %). У выніку, ідучы ад тэматыкі ўспрымання, вучні сярэдніх і старшых класаў мяркуюць, напрыклад, аб прозе В.Быкава як "аповесці пра вайну", што выяўляе абмежаваны погляд на творчасць пісьменніка. Жанравая спецыфіка твора дазваляе наблізіць вучняў да абагуленага, цэласнага, глыбокага разумення прозы, выявіць асаблівасці паэтыкі твора, стылю пісьменніка, мастацкага напрамку ў цэлым, таму невыпадкова, што ў школьнай праграме (Мінск, 2002), метадычным забеспячэнні гэтай праграмы (падручнікі для 7, 9, 11 класаў) жанр займае цэнтральнае месца сярод іншых тэарэтыка-літаратурных паняццяў, вызначае логіку вывучэння матэрыялу і ў сярэдніх, і ў старшых класах.

**У трэцяй главе "Метадычная сістэма вывучэння празаічных твораў у**

Репозиторий БарГУ

**жанравай спецыфіцы на ўроках беларускай літаратуры ў 7 – 11 класах (фарміруючы эксперымент)”** адлюстравана вопытна-эксперыментальная работа (СШ № 2, 3 г. Клецка, Грыцэвіцкая, Заастравецкая, Сіняўская СШ Мінскай вобласці, слухачы падрыхтоўчага аддзялення БНТУ, філіял г. Баранавічы) і яе вынікі, раскрываецца змест, прынцыпы, формы, метады і прыёмы, якія забяспечваюць канцэптуальнае вывучэнне ў 7 – 11 класах сучаснай беларускай прозы (творчасць В.Быкава, В.Казько). Мэта заключалася ў выяўленні і ўдасканаленні аптымальных шляхоў і спосабаў вывучэння школьнікамі сучаснай беларускай прозы на аснове яе мастацка-эстэтычнай спецыфікі і жанравай дэфініцыі. Улічваючы зацікаўленасць вучняў аповесцямі і раманамі (*пераважная цікавасць да прозы – 55%, лірыкі – 22%, драмы – 23%*) і неабходнасць развіцця літаратурнага густу школьнікаў, навучальныя мэты былі сфармуляваны на матэрыяле прозы В.Быкава і В.Казько. Аналіз дапаўняўся творамі Я.Брыля, Ф.Дастаеўскага, А.Камю.

У працэсе эксперыменту мы імкнуліся выявіць:

1. Актуальнасць прапанаванай праграмы для вучняў 7 – 11 класаў агульнаадукацыйных школ.
2. Эфектыўнасць заняткаў па развіцці эстэтычных ацэнак школьнікаў; паглыбленне тэарэтыка-літаратурных ведаў у галіне жанравай спецыфікі празаічных твораў, павышэнне цікавасці да сучаснай беларускай прозы.

Пры гэтым вырашаліся наступныя задачы: удасканальваць як інтэлектуальную, так і пачуццёвую сферу дзейнасці школьнікаў; пашыраць досвед адносна беларускай літаратуры ў кантэксце еўрапейскай; стымуляваць арыгінальнасць мыслення; паглыбляць гуманістычны светапогляд асобы.

Крытэрыі, па якіх ацэньваліся вынікі вопытнай работы, наступныя: а) аб’ём, устойлівасць, глыбіня ведаў аб празаічных жанрах (аповесць, раман) і мастацкай прыродзе прозы; б) уменне ажыццяўляць спалучаны аналіз зместу і формы празаічнага твора; в) прыходзіць да высноў канцэптуальнага характару пра творчасць пісьменніка, разумець твор у разнастайных мастацкіх кантэкстах; в) валоданне тэарэтыка-літаратурнымі паняццямі; г) здольнасць самастойна і арыгінальна мысліць, лагічна выказваць думкі ў вуснай і пісьмовай формах.

Эксперыментальнае навучанне было арганізавана такім чынам, каб развіваць эстэтычнае ўспрыманне вучняў праз выкарыстанне мастацкага патэнцыялу жанру. Найважнейшым элементам жанру аповесці В.Быкава з’яўляецца трагедыя, якая ў XX стагоддзі як літаратурны жанр амаль знікла, але як элемент жанру і эстэтычная катэгорыя прысутнічае ў многіх творах. Каб папярэдзіць павярхоўнае ўспрыманне трагічнага ў творчасці В.Быкава, вучні эксперыментальных 11 класаў знаёміліся з трагічным як навуковым паняццем у форме лекцыі, пасля якой па тэме арганізоўваўся ўрок-семінар па аповесці “Знак бяды”.

Рэпазіторый БарДУ

Жанравая спецыфіка празаічнага твора дапамагае выявіць асаблівасці творчага метаду і стылю пісьменніка. Аповесці В.Быкава вывучаліся як узоры рэалістычнага пісьма, пры гэтым праводзіліся паралелі з рускай класічнай літаратурай – прозай Ф.Дастаеўскага. Жанравая аснова аповесцей беларускага пісьменніка прадстаўлялася не толькі як рэалістычная, але і ў рэчышчы экзістэнцыялізму. Заўважым, што матэрыял выкладаўся старшакласнікам даступна, з выкарыстаннем навучальнай табліцы пра сутнасць экзістэнцыйнага светапогляду. У якасці жанравай асновы параўноўвалася трагічнае гучанне прозы В.Быкава і А.Камю. Плённасць абранага падыходу засведчылі вусныя адказы вучняў і пісьмовыя выказванні на тэму "Экзістэнцыялізм у творчасці В.Быкава". Эксперымент паказаў, што вывучэнне прозы ў яе жанравай спецыфіцы з апорай не на тэматычную, а стылёвую характарыстыку спрыяе інтэнсіфікацыі літаратурнай адукацыі і ў сярэдніх, і старшых класах.

У ходзе эксперыменту былі выяўлены магчымасці працы з жанрам на ўзроўні паэтыкі твора, якая з'яўляецца прадметам тэарэтычнага засваення літаратуры ў сярэдніх класах (аповесці В.Быкава "Жураўліны крык", "Аблава"), аднак мэтазгоднасць такога падыходу відавочная і на заключным этапе школьнай адукацыі. Спецыфіка вывучэння празаічных жанраў у старшых класах вымагае не столькі вызначэнне агульнай разнавіднасці жанру (аповесць, раман), колькі яго індывідуальнай прыкметы ў канкрэтным творы. Таму пры вывучэнні прозы В.Быкава рабіўся акцэнт на асаблівасцях паэтыкі "лакальнай" аповесці, творчасці В.Казько – рамана-хронікі, філасофскага рамана ("Хроніка дзетдомаўскага саду"). Такім чынам, у даследаванні паказана паэтапная работа над прозай В.Быкава і В.Казько ў яе жанравай спецыфіцы: 7 клас – пачатковы этап, 9 клас – базавы, 11 – заключная ступень.

Школьнікаў мэтазгодна далучаць і да некаторых агульных тэарэтыка-літаратурных праблем. Так, вучні эксперыментальных класаў запісвалі асацыяцыі, якія ў іх выклікае масавая літаратура і элітарная; па групах адстойвалі меркаванне ў форме аргументаў і контраргументаў наконт правамернасці іерархіі жанраў у прозе. Вынікі працы наступныя: на пытанне, ці здаюцца вам цікавымі і патрэбнымі заданні, дзе трэба прааналізаваць змест твора праз яго форму (жанравую), 86% апытаных адказалі станоўча, па выніках канстатуючага эксперыменту – менш за 50%.

З мэтай пабудовы цэласнай мадэлі вывучэння празаічнага твора намі прапанаваны асобныя творчыя заданні, якія дапаўняюць самастойную працу школьнікаў. Пры разглядзе жанравай спецыфікі твора быў зроблены акцэнт на моўным кампаненце. У эксперыментальнай методыцы апрабаваны шматузроўневыя заданні: ад назіранняў за арганізацыяй слоў у творах розных жанраў да "спробы пяра". Гэтыя заданні распрацаваны для забеспячэння пераемнасці паміж сярэдняй і вышэйшай школай, фарміравання ўменняў вучняў

Рэпазіторый БарДУ

уласнага набыцця ведаў, выкарыстання навуковых крыніц, асабістых назіранняў, пошукавай дзейнасці.

Узровень сфарміраванасці ведаў і ўменняў, небходных для вывучэння прозы з улікам жанравай спецыфікі, ацэньваўся ў ходзе выніковага тэставання і аналізу напісаных вучнямі 7 – 11 класаў выніковых сачыненняў. Эфектыўнасць прапанаванай методыкі пацвярджаецца даследаваннямі на прыкладзе кантрольных і эксперыментальных класаў, абагульненыя ў табліцах.

Выніковая эксперыментальная праверка ведаў і ўменняў, неабходных для вывучэння прозы з улікам жанравай спецыфікі ў сярэдніх класах.

| Веды і ўменні | Эксперыменталь-ныя класы | Кантрольныя класы |
|---|---|---|
| Веданне асноўнай праблематыкі твораў | 97 % | 56 % |
| Веданне істотных асаблівасцей прозы і яе жанраў на ўзроўні паэтыкі | 85 % | 40 % |
| Уменне вызначаць родава-жанравую прыналежнасць твора | 90 % | 37 % |
| Уменне суадносіць ідэйны змест з асаблівасцямі кампазіцыі, эстэтычным фонам, мастацка-выяўленчымі сродкамі | 85 % | 34 % |

Выніковая эксперыментальная праверка ведаў і ўменняў, неабходных для вывучэння прозы з улікам жанравай спецыфікі ў старшых класах.

| Веды і ўменні | Эксперыменталь-ныя класы | Кантрольныя класы |
|---|---|---|
| Веданне асноўных ідэйна-маральных праблем, агульначалавечага значэння празаічных твораў | 98 % | 53 % |
| Веданне спецыфічных прыкмет прозы і яе жанраў на ўзроўні стылю | 88 % | 43 % |
| Уменне выяўляць структурныя часткі твора, сродкі паэтычнай выразнасці, якія вызначаюць жанравую спецыфіку | 92 % | 48 % |
| Уменне аналізаваць твор у адзінстве зместу і формы (жанравай) | 87 % | 35 % |
| Уменне суадносіць аповесці, раманы з разнастайнымі кантэкстамі | 80 % | 19 % |
| Уменне даваць самастойную ацэнку творам з улікам іх мастацка-эстэтычнай сутнасці | 83 % | 52 % |

Аналіз работ паказаў, што паміж узроўнем ведаў і ўменняў вучняў кантрольных і эксперыментальных класаў назіраецца істотная розніца.

Рэпазіторый БарДУ

Эксперыментальная методыка забяспечвае эфектыўнасць вывучэння сучаснай беларускай прозы з улікам жанравай спецыфікі. Вучні і сярэдніх, і старшых класаў ведаюць асноўны маральны змест твораў, валодаюць у межах школьнай праграмы (а ў асобных выпадках і паглыблена) тэарэтычнымі паняццямі, звязанымі з родава-жанравай прыналежнасцю твораў; умеюць ажыццяўляць спалучаны аналіз зместу і формы твора, суадносіць эстэтычны фон, кампазіцыю, выяўленчыя сродкі з праблематыкай; выказваць самастойныя думкі і меркаванні наконт прачытанага. Галоўны пазітыўны вынік бачыцца ў тым, што ў адказах школьнікаў быў пераадолены тэматычны падыход (пераважнае пераказванне сюжэта), чаго не было ў папярэдніх пісьмовых работах, а таксама не назіралася і ў кантрольных класах. Такім чынам, вопыт правядзення заняткаў па вывучэнні ў 7 – 11 класах сучаснай беларускай прозы праз прызму жанравай спецыфікі можна лічыць удалым.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

По выніках даследавання можна зрабіць наступныя высновы:

1. Праблема жанравай спецыфікі мастацкага твора мае багатую традыцыю, якая бярэ пачатак з антычнасці і актыўна распрацоўваецца ў сучасным літаратуразнаўстве. Многія даследчыкі звяртаюць увагу на такія факты, як устойлівасць, кананічнасць жанру і яго зменлівасць, рухомасць. Гэта абумоўлівае відазмяненні жанравых структур (родава-жанравыя перакрыжаванні) і вызначае стылістычную характарыстыку твора на ўсіх узроўнях – стыль нацыянальны, мастацкага напрамку, індывідуальны стыль пісьменніка, стыль перыяду творчасці.

Яшчэ адзін найважнейшы аспект праблемы – вызначэнне сукупнасці змястоўных і фармальных прыкмет, якія абгрунтоўваюць жанравую спецыфіку твора. У агульных рысах навукоўцы звязваюць градацыю жанравых форм як са зменамі семантычнага ядра, так і прынцыпамі пабудовы мастацкага твора, сродкамі паэтычнай выразнасці. Асэнсаванне жанру як тыпалагічнай і сэнсавай мадэлі, “генетычнай” і “набытай” праграмы твора спрыяе пошуку аптымальных шляхоў вывучэння прозы ў сярэдніх і асабліва ў старшых класах. Аналіз прозы з улікам жанравай спецыфікі дапамагае ўдакладніць накірункі, здольныя стымуляваць каштоўнасную маральна-эстэтычную сутнасць урока літаратуры, дапоўніць, сістэматызаваць і тэарэтычна асэнсаваць спосабы інтэнсіфікацыі пазнавальнай дзейнасці вучняў, выпрацаваць канкрэтныя практычныя рэкамендацыі для настаўнікаў-славеснікаў. Значэнне жанравай спецыфікі пры вывучэнні прозы бачыцца ў магчымасці сфарміраваць дастаткова высокі ўзровень тэарэтычных ведаў вучняў па літаратуры [1, 2, 3, 5, 8].

2. Канстатуючыя зрэзы, што былі праведзены ў СШ № 2, 3 г. Клецка, Сіняўскай, Грыцэвіцкай, Заастравецкай СШ Клецкага раёна Мінскай вобласці,

Рэпазіторый БарДУ

выявілі недастатковы базавы ўзровень ведаў школьнікаў пра жанрава-стылёвыя асаблівасці сучаснай беларускай прозы, мастацкую спецыфіку літаратуры ў цэлым. Вынікі канстатуючага эксперыменту пацвердзілі неабходнасць развіцця як сферы эстэтычных пачуццяў вучняў, так і аналітычных дзеянняў, умення ажыццяўляць спалучаны аналіз зместу і формы твора, здольнасці канцэптуальна ацэньваць празаічны твор у кантэксце індывідуальнай паэтыкі, мастацкага напрамку, гістарычнай эпохі [1, 7, 10].

3. Поспех літаратурнага навучання ў многім залежыць ад зместу праграмнага матэрыялу. У гэтым сэнсе вывучэнне ў 7 – 11 класах сучаснай беларускай прозы праз прызму жанравай спецыфікі мае найбольшыя магчымасці ў рэалізацыі мэт і задач літаратурнай адукацыі. У ходзе фарміруючага эксперыменту ставілася задача на матэрыяле творчасці В.Быкава і В.Казько развіваць успрымальнасць вучняў да беларускай прозы з мэтай змяншэння ўплыву масавай культуры. Па выніках эксперыменту, знаёмства з аповесцямі і раманамі беларускіх аўтараў павялічвае шанцы на тое, каб школьнікі ацэньвалі мастацкія вартасці твора не па знешнім, фабульным дзеянні, займальнасці сюжэта, а глыбіні маральнай праблематыкі, майстэрстве ўвасаблення ідэі ў творы пэўнага жанру. Вывучэнне сучаснай беларускай прозы, такім чынам, папярэджвае фарміраванне прагматычных (як сродак забавы) адносінаў да літаратуры.

Аналіз школьнікамі сучаснай беларускай прозы развівае ўменне самастойна ацэньваць твор, рабіць уласныя назіранні, вывады. Вучань выступае не ў якасці спажыўца чужых, індывідуальна неасвоеных мастацкіх ідэй (у інтэрпрэтацыі літаратурных крытыкаў і настаўніка), а ў ролі сааўтара, актыўнага чытача, які здольны ўбачыць уласны сэнс твора, варыянтнасць мастацкага вобраза, неадназначнасць маральных праблем і спосабаў іх вырашэння. Іншымі словамі, вывучэнне празаічных твораў садзейнічае фарміраванню дывергентнага мыслення, якое скіроўвае вучнёўскую думку да варыятыўнасці разважанняў, а гэта набывае асаблівую актуальнасць для школьнікаў у развіцці аўтаномнасці асобы і яе камунікабельнасці.

Такім чынам, падабраны для даследавання літаратурны матэрыял (сучасная беларуская проза) з'яўляецца перспектыўным у плане вырашэння выхаваўчых задач, якія стаяць перад сучаснай школай [1, 5, 6, 7].

4. Вывучэнне празаічных твораў на аснове жанравай спецыфікі ў 7 – 11 класах грунтуецца на прынцыпе творчага навучання, якое ахоплівае розныя аспекты:

- падбор матэрыялу для працы на ўроку: а) мастацкага, што вызначаецца не толькі беларускай, але і рускай, еўрапейскай літаратурай; творамі іншых відаў мастацтва (у прыватнасці, жывапісу); б) тэарэтыка-літаратурнага – як навуковае паняцце жанр празаічнага твора ў пэўнай ступені зарыентаваны на стандартнасць, адназначнасць, "сухасць" успрымання. Нягледзячы на гэта,

Рэпазіторый БарДУ

тэарэтычны ўхіл стымулюе не толькі рэпрадуктыўную, але і творчую актыўнасць вучняў, паколькі забяспечвае вывучэнне твора ў адзінстве зместу і формы;

- інтэрпрэтацыя аповесці, рамана. Наватарства, уменне выйсці за рамкі звыклых уяўленняў праяўляецца тады, калі вучань выступае ў якасці творцы, адкрывальніка шматзначных мастацкіх вобразаў пры самастойным чытанні і калектыўным аналізе твора на ўроку;

- уласна мастацкая творчасць вучняў – гэта найвышэйшы ўзровень далучэння школьнікаў да літаратуры, калі ступень праяўлення актыўнасці вызначаецца даступным для вучня максімумам;

- выбар метадаў і форм навучання. Празаічны твор уяўляе сабой вынік творчай дзейнасці яго аўтара, таму і методыка навучання мае патрэбу ў навізне, разнастайнасці, дыферэнцыянаванасці.

Усе названыя аспекты, якія, на нашу думку, у значнай ступені дапамагаюць рэалізаваць прынцып творчага навучання, прадстаўлены ў даследаванні ў выглядзе тэарэтыка-метадалагічных і метадычных праблем вывучэння сучаснай беларускай прозы [1, 3, 4, 6, 7, 9].

5. Як сістэмнае літаратуразнаўчае паняцце жанр дазваляе пабудаваць мадэль комплекснага вывучэння празаічнага твора ў сярэдніх і старшых класах. Цэласнасць аналізу забяспечваецца сістэмай прыкмет, якія вызначаюць жанравую спецыфіку твора. Сюды адносяцца паняцці, што характарызуюць асаблівасці мастацкай спецыфікі літаратуры (эстэтычны фон), дэманструюць змест, структуру твора (тэматыка, кампазіцыя, мастацка-выяўленчыя сродкі), асвятляюць яго ў кантэксце гістарычнага працэсу (мастацкія напрамкі, стылі ў іх тыпалагічным значэнні). Такі шырокі спектр тэарэтыка-літаратурных паняццяў, звязаных з жанравай характарыстыкай твора, азначае магчымасць прыцягнення розных аспектаў літаратуразнаўства (ідэйна-эстэтычнага, гісторыка-генетычнага, гісторыка-функцыянальнага і тыпалагічнага) да аналізу аповесці, рамана. Названая залежнасць робіць відавочным той факт, што жанр сапраўды з'яўляецца асновай для сістэмнага вывучэння прозы.

Цэласнасць успрымання мастацкай літаратуры дасягаецца пастуnова, калі твор па жанравых прыкметах (эстэтычная дамінанта, кампазіцыя, моўнае аблічча і інш.) раз'ядноўваецца на элементы, а затым сінтэзуецца ў адзінае цэлае. Такім чынам, жанр забяспечвае вывучэнне празаічнага твора поўна, у суадносінах "аналіз – сінтэз". Такое дыялектычнае вымярэнне можа мець месца на асобным уроку, пры вывучэнні блока тэм ці ўвогуле курса літаратуры. Так, у сярэднім звяне знаёмства з прозай праз прызму жанру набліжае вучняў да разумення эмпірычнага ўзроўню твора (аналіз), таму жанр тут больш звязаны з пытаннямі паэтыкі, структуры твора. У старшых класах жанравая спецыфіка спрыяе разуменню школьнікамі твора ў завершаным выглядзе, стымулюе канцэптуальнасць успрымання (сінтэз). Па гэтай прычыне ў 11 класе найбольш

Репозиторий БарГУ

актуальныя прыкметы жанру, што вызначаюць прозу ў разнастайных кантэкстах і прыводзяць да разумення аўтарскага стылю, у чым і заключаецца спецыфіка вывучэння празаічнага твора з улікам жанру ў старшых класах [1, 8].

6. Распрацаваная для 7 – 11 класаў методыка вывучэння празаічных твораў на аснове жанравай спецыфікі ўключае сістэму заданняў, якая спалучае элементы мінулага вопыту беларускай школы і таго, што звязана з дэмакратызацыяй грамадства. Пры захаванні станоўчых бакоў традыцыйнай формы навучання (арганізацыйная дакладнасць, упарадкаванасць, сістэматычнасць падачы матэрыялу, аптымальныя затраты часу ва ўмовах масавасці) зроблена спроба пераадолення яе негатыўных выдаткаў такіх, як усярэднены падыход, слабая зваротная сувязь паміж настаўнікам і вучнем, пасіўнасць школьніка, шаблонная пабудова ўрока. Праведзенае даследаванне заснавана на распрацоўцы індывідуальных і групавых заданняў, якія стымулююць актыўнасць вучняў; пашыраюць пісьмова-маўленчую дзейнасць школьнікаў (разгорнутыя і міні-сачыненні, даклады, рэфераты, паведамленні, выпіскі цытат з вывучаемага твора, канспектаванне тэарэтычнага матэрыялу); скіроўваюць на выкарыстанне інтэгратыўных сувязей (літаратура – мова, літаратура – эстэтыка, літаратура – філасофія). Самастойная дзейнасць вучняў набывае важнае значэнне на заключным этапе агульнаадукацыйнага навучання, паколькі ў іх ёсць патрэба ў адаптацыі да ўмоў ВНУ. З гэтае прычыны ў эксперыментальных класах паспяхова ўкараняліся элементы лекцыйна-семінарскай сістэмы заняткаў, заданні павышанай складанасці (пошукавы і даследчы метады як варыянты праблемнага навучання); уласна праблемны падыход на ўсіх этапах (пры тлумачэнні, замацаванні, кантролі) склаў аснову распрацаванай методыкі.

Як паказалі вынікі даследавання, абнаўленню спосабаў і прыёмаў вывучэння літаратуры спрыяе таксама ўкараненне альтэрнатыўных падыходаў, якія садзейнічаюць духоўнаму, эмацыянальна-эстэтычнаму развіццю асобы, напрыклад, выкарыстанне элементаў асацыятыўнай мадэлі ведаў у супрацьвагу інфармацыйнай, разлічанай пераважна на развіццё інтэлектуальнай сферы вучняў [1, 2, 5, 6, 7, 9].

Репозиторий БарГУ

## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ ПРАЦ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

### Манаграфія

1. Грыцаль (Пучынская) Т.М. Праблема вывучэння жанравай спецыфікі празаічных твораў на ўроках беларускай літаратуры ў 11 класе. – Мінск: УП "Тэхнапрынт", 2003. – 97 с.

### Метадычны дапаможнік

2. Грыцаль (Пучынская) Т.М. Беларуская літаратура ў школе: вывучэнне сучаснай прозы ў старшых класах / Метадыч. дапам. – Мінск: УП "Тэхнапрынт", 2003. – 20 с.

### Артыкулы ў навуковых часопісах

3. Грыцаль (Пучынская) Т.М. Тэарэтыка-метадычныя асновы фарміравання паняцця пра жанр пры вывучэнні беларускай прозы ў старэйшых класах // Бел.мова і літ.у школе. – 2002. – № 1. – С. 37 – 46.

4. Грыцаль (Пучынская) Т.М. Вывучэнне паэмы Р. Барадуліна "Вяртанне ў першы снег" у 9 класе // Родн. слова. – 2001. – № 10. – С. 59 – 62.

5. Грыцаль (Пучынская) Т.М. Фарміраванне тэарэтыка-літаратурнай кампетэнцыі і мастацка-эстэтычнай культуры вучняў у працэсе вывучэння беларускай прозы ў старэйшых класах // Веснік МДУ імя А. Куляшова. – 2003. – № 4. – С. 197 – 201.

### Артыкулы ў навуковых зборніках

6. Грыцаль (Пучынская) Т.М. Экзістэнцыялізм у аповесці В. Быкава „Аблава" (да праблемы вывучэння на ўроках беларускай літаратуры ў старэйшых класах) // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: Матэрыялы V Міжнар. навук. канф., прысвеч. 80-годдзю Белдзяржуніверсітэта (Мінск, 16-18 кастр. 2001 г.): У 3 ч. – Мінск: БДУ, 2001. – Ч.1: Беларуская літаратура ў кантэксце сусветнай . – С. 51– 55.

7. Грыцаль (Пучынская) Т.М. Праблема аналізу жанрава-стылёвай спецыфікі аповесці В. Казько „Прахожы" на факультатыўных занятках па беларускай літаратуры // Пісьменнік – мова – стыль: Матэрыялы II Міжнар. навук. канф., прысвеч. 75-годдзю з дня нар. праф. Л.М. Шакуна (Мінск, 15-16 лістап. 2001 г.) / Рэдкал.: М.Р. Прыгодзіч і інш.: У 2 т. – Мінск, РІВШ БДУ, 2002. – С. 390. – 392.

8. Грыцаль (Пучынская) Т.М. Празаічныя жанры ў сістэме тэарэтычных паняццяў па беларускай літаратуры ў сярэдняй школе // Акадэмік М.А. Лазарук і праблемы літаратурнай адукацыі ў Беларусі: Матэрыялы рэсп. мемар. навук. чытанняў „Навукова-педагагічная і літаратуразнаўчая спадчына акадэміка М.А. Лазарука" (Мінск, 4 кастр. 2001 г.) // Рэдкал. А.І. Бельскі (адказ. рэд.) і інш. – Мінск: НІА, 2003. – С. 168 – 175.

9. Грыцаль (Пучынская) Т.М. Праблема вывучэння твораў В.Казько з улікам жанравай спецыфікі ў старэйшых класах // Актуальныя праблемы літаратурнай адукацыі на сучасным этапе рэформы школы: Зб. навук. арт. / Склад.

Репозиторий БарГУ

А.І. Бельскі, М.Ф. Печанко. – Мінск: НІА, 2003. – С. 169 – 173.

**Тэзісы канферэнцый**

10. Грыцаль (Пучынская) Т.М. Аўтаномная асоба як адукацыйная каштоўнасць (да праблемы выкладання беларускай літаратуры) // Тез. межвуз. науч.-метод. конф. профессорско-преподавательского состава БНТУ, посвящ. 5-летию образования филиала БНТУ г. Барановичи. – Барановичи, 2002. – С. 16 – 18.

Репозиторий БарГУ

## РЭЗЮМЕ

**Пучынская Тацціяна Міхайлаўна**

**Методыка вывучэння празаічных твораў сучаснай беларускай літаратуры на аснове іх жанравай спецыфікі (7 – 11 класы)**

**Ключавыя словы:** жанравая спецыфіка, сучасная беларуская проза, паэтыка, эстэтычны кампанент, канцэптуальнае вывучэнне, фарміраванне чытацкіх навыкаў, тэарэтычны і выхаваўчы аспект выкладання, гуманізм.

**Аб'ект даследавання** – працэс вывучэння празаічных твораў сучаснай беларускай літаратуры В.Быкава і В.Казько на аснове жанру ў 7 – 11 класах сярэдняй школы.

**Прадмет даследавання** – методыка вывучэння празаічных твораў В.Быкава і В Казько з улікам жанравай спецыфікі ў 7 – 11 класах сярэдняй школы.

**Мэта даследавання** – распрацаваць методыку вывучэння ў 7 – 11 класах празаічных твораў сучаснай беларускай літаратуры на аснове жанравай спецыфікі.

**Метады даследавання** – тэарэтычны аналіз філасофскай, псіхолага-педагагічнай, літаратуразнаўчай і метадычнай літаратуры ў аспекце пастаўленай праблемы, вывучэнне педагагічнага вопыту настаўнікаў, аналіз сучаснага стану выкладання літаратуры ў школе, праграм і падручнікаў; анкетаванне, канстатуючы і фарміруючы педагагічныя эксперыменты з мэтай апрабацыі прапанаванай методыкі, колькаснае і якаснае абагульненне вынікаў эксперыментаў.

**Навуковая навізна атрыманых вынікаў:** вызначана праблемная насычанасць і выхаваўчы патэнцыял празаічных твораў В.Быкава (7 – 11 класы), В.Казько (11 клас) з улікам эстэтыка-філасофскай і жанрава-стылёвай спецыфікі беларускай прозы; выяўлена роля жанравай спецыфікі празаічнага твора ў забеспячэнні сістэмнасці, упарадкаванасці, дастатковасці, інфармацыйнай насычанасці літаратуразнаўчай адукацыі школьнікаў; сістэматызаваны тэарэтыка-літаратурныя паняцці (тэматыка, кампазіцыя, мастацкая дэталь, моўнае афармленне, эстэтычны фон, стыль, творчы метад), звязаныя з жанравай характарыстыкай твора; абгрунтаваны, сістэматызаваны і пашыраны спосабы і метады працы над празаічнымі творамі на аснове жанравай спецыфікі; распрацавана і эксперыментальна праверана методыка вывучэння аповесцей і раманаў В.Быкава і В.Казько (7 – 11 класы) у іх жанравай спецыфіцы ў аспекце ўдасканалення літаратурнага навучання.

Вынікі могуць быць выкарыстаны на ўзроўні навукова-метадычнага забеспячэння выкладання курса беларускай літаратуры ў 7 – 11 класах.

Репозиторий БарГУ

**РЕЗЮМЕ**

**Пучинская Татьяна Михайловна**

**Методика изучения прозаических произведений современной белорусской литературы на основе их жанровой специфики (7 – 11 классы)**

**Ключевые слова:** жанровая специфика, современная белорусская проза, поэтика, эстетический компонент, концептуальное изучение, формирование читательских навыков, теоретический и воспитательный аспект преподавания, гуманизм.

**Объект исследования** – процесс изучения прозаических произведений современной белорусской литературы на основе жанра в 7 – 11 классах средней школы.

**Предмет исследования** – методика изучения прозаических произведений В.Быкова и В.Казько с учетом жанровой специфики в 7 – 11 классах средней школы.

**Цель исследования** – разработать методику изучения в 7 – 11 классах прозаических произведений современной белорусской литературы на основе их жанровой специфики.

**Методы исследования** – теоретический анализ философской, психолого-педагогической, литератураведческой и методической литературы в аспекте поставленной проблемы, изучение педагогического опыта учителей, анализ современного состояния преподавания литературы в школе, программ и учебников; анкетирование, констатирующий и формирующий педагогические эксперименты с целью апробации предложенной методики, количественное и качественное обобщение результатов экспериментов.

**Научная новизна полученных результатов:** определена проблемная насыщенность и воспитательный потенциал прозаических произведений В.Быкова (7 – 11 классы) и В.Казько (11 класс) с учетом эстетико-философской и жанрово-стилевой специфики белорусской прозы; выявлена роль жанровой специфики прозаического произведения в обеспечении системности, упорядоченности, достаточности, информационной насыщенности литератураведческого образования школьников; систематизированы теоретико-литературные понятия (тематика, композиция, художественная деталь, языковое оформление, эстетический фон, стиль, творческий метод), связанные с жанровой характеристикой произведения, обоснованы, систематизированы и расширены способы и методы работы над прозаическими произведениями на основе жанровой специфики; разработана и экспериментально проверена методика изучения повестей и романов В.Быкова и В.Казько (7 – 11 классы) и их жанровой специфики в аспекте совершенствования литературного обучения. Результаты могут быть использованы на уровне научно-методического обеспечения преподавания курса белорусской литературы в 7 – 11 классах.


Репозиторий БарГУ

# RESUME

**Puchinskaya Tatyana Mihailovna**

## Methods of studying prose works of modern Belarusian literature on the basis of their genre specificity (7 – $11^{th}$ forms)

**Key words**: genre specificity, modern Belarusian prose, poetry, aesthetic component, conceptional studying, formation of readers' skills, theoretical and educational aspect of teaching, humanist.

**Object of investigation**: the process of studying prose works of modern Belarusian literature on the basis of its genre in the 7 – $11^{th}$ forms of secondary school.

**Subject of investigation**: methods of studying prose works by V.Bykov and V.Kazko on the basis of genre specificity in the 7 – $11^{th}$ forms of secondary school.

**Purpose of investigation**: to develop methods of studying prose works of modern Belarusian literature on the basis of their genre specificity in the 7 – $11^{th}$ forms of secondary school.

**Methods of investigation**: theoretical analysis of philosophical, psychological-pedagogical and methodological literature in the aspect of the indicated problem; study of pedagogical experience of teachers, analysis of contemporary state of teaching literature at school, of programs and text-books; observation of pedagogical process at school providing general education, filling in a form, a certified pedagogical experiment, a forming pedagogical experiment with the purpose of approbation of the proposed methods, guantative and gualitative generalization of the experimental data.

**Scientific novelty of the results achieved**: educational and problematic potential of prose works by V.Bykov (7 – $11^{th}$ forms) and V.Kazko ($11^{th}$ form) is identified with aesthetico-philosophical and genre-stylistical specificity of Belarusian prose in view; the role of genre specificity of a prose work, serving the systematic regulation and information saturation of literary education of pupils is identified; some theoretico-literary notion, dealing with genre characteristics of literary works studied by middle-level and senior pupils (theme, composition, fiction detail, language framing, aesthetical background, style, creative method) are systematized; ways and methods of studying prose works on the basis of their genre specificity are proved, systematized and extended; methods of studying stories and novels by V.Bykov and V.Kazko (7 – $11^{th}$ forms), with their genre specificity in vies, are developed and experimentally verified in the aspect of perfection of literary education.

The results may be used on the level of scientific, methodological provision of teaching Belarusian literature in the 7 – $11^{th}$ forms.

Репозиторий БарГУ

Репозиторий БарГУ

Репозиторий БарГУ

Репозиторий БарГУ

Репозиторий БарГУ

РНБ Русский фонд

2004-4
7565

Репозиторий БарГУ

Подписано в печать 8.01.04. Формат 60x84/16. Бумага офсетная.
Тираж 100 экз. Заказ № 340

Издательство УП «Технопринт». ЛВ № 380 от 28.04.99.
Отпечатано в типографии УП «Технопринт», ЛП № 203 от 26.01.03.
220027, Минск, пр-т Ф. Скорины, 65, корп. 14, оф. 317.
Тел/факс 231-86-93